ДУК «БІБЛІЯТЭЧНАЯ СЕТКА ХОЦІМСКАГА РАЁНА»
БЯРОЗКАЎСКАЯ СЕЛЬСКАЯ БІБЛІЯТЭКА

# НА ХВАЛІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ



2020 г.

Шаноўныя чытачы!

Прапануем вашай увазе выставу сучаснай беларускай літаратуры і спадзяёмся, што творы нашых суайчыннікаў не застануцца па-за вашай чытацкай увагай!

Прыемнага прагляду!

«Ты зжылося з намі,
бацькаўскае слоўца,
як бы корань з дрэвам,
як бы з небам сонца!»

*Янка Купала*




Гальпяровіч, Н. Я. Подых пяшчоты : проза / Навум Якаўлевіч Гальпяровіч. — Мінск : Звязда, 2019. — 240 с.

***У зборнік вядомага пісьменніка Навума Гальпяровіча ўвайшлі аповесць "Подых пяшчоты", навелы, эсэ і сентыментальная хроніка.***

***Шчырасць і спавядальнасць - вось што прыцягвае чытачоў. Часам нават цяжка знайсці мяжу паміж героем твораў і самім аўтарам, хаця пісьменнік пастаянна заклікае не атаясамліваць сваіх персанажаў з рэальнымі людзьмі. Але ў сентыментальнай хроніцы дзейнічаюць не прыдуманыя, а рэальныя асобы. Усё гэта складае своеасаблівы свет - дабрыні, прыгажосці і сапраўднай пяшчоты.***

Шырко, В. Нязваны госць : аповесці / Васіль Шырко. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2017. — 453, [2] с.




*Вострасюжэтныя аповесці лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Васіля Шырко чытаюцца на адным дыханні. Невялікія памерам, глыбокія па змесце, яны, несумненна, зацікавяць чытачоў.*

*Героі трапляюць у экстрэмальныя сітуацыі. Маладую пару медыкаў адпраўляюць на некалькі гадоў у Рэспубліку Гвінею, дзе яны змагаюцца са страшнай лепрай, знаходзяць сяброў. Герой абароны Сталінграда генерал Чуйкоў збіраецца сурова пакараць маладога, ні ў чым не вінаватага афіцэра, з якім сустракаецца праз шмат гадоў пасля вайны. Генерал ужо двойчы Герой, маршал, але і афіцэр — палкоўнік, Герой Савецкага Саюза.*

*Аповесці ўпрыгожваюць былі, прымаўкі, нязмушаная родная мова.*




**Гніламёдаў, У. Валошкі на мяжы : раман / Уладзімір Гніламёдаў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2014. — 574 с. — (Беларуская проза XXI стагоддзя).**

***Раман «Валошкі на мяжы» прысвечаны жыццю Заходняй Беларусі ў міжваеннае дваццацігоддзе ва ўмовах польскага санацыйнага рэжыму. Тэма не новая, але аўтар знаходзіць новыя падыходы, меру праўдзівасці і рэалізму ў паказе сваіх герояў, іх жыцця, імкненняў, ахопе псіхалогіі чалавека і тых абставінаў, у якіх ён знаходзіцца. Раман выразна адлюстроўвае асабістасці менталітэту, нацыянальнай свядомасці беларускага народа, тое, што фарміравалася на працягу многіх гадоў сацыяльна-эканамічным і палітычным становішчам гэтага краю.***




**Федарэнка, А. М. Ціша : аповесці, апавяданні / Андрэй Федарэнка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2014. — (Беларуская проза XXI стагоддзя ).**

***Кнігу складаюць дзве новыя аповесці Андрэя Федарэнкі, а таксама тэматычна блізкія ім дзесяць апавяданняў, напісаных у розныя гады. З першага погляду ягоныя творы апавядаюць пра звычайныя лёсы людзей. Здаецца, Федарэнка можа напісаць твор пра любога (!) чалавека. Пра яго адносіны з блізкімі, пра тое, як ён ездзіць на рыбалку або па грыбы, пра яго працу і сямейныя дачыненні — то бок пра самае-самае будзённае. Але пісьменнік знойдзе ў кожным лёсе нейкую струну, якая гучыць як камертон. І прачытаўшы такі тэкст, гэты гук доўга яшчэ застаецца ў тваёй душы і штосьці ў ёй вярэдзіць і прымушае думаць і разважаць.***

**Латышкевіч, М. Наш дом : апавяданні, аповесці / Маргарыта Латышкевіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2018. — 349 с. — (Час 21).**




***У кнізе пад адной вокладкай сабраныя самыя розныя творы — як у гарадскіх шматпавярховых дамах пад адным дахам сабраныя самыя розныя людзі. Тут ёсць і кароткія апавяданні, ад гумарыстычных і іранічных да сумных і кранальных. Усё — пільныя назіранні за рэальным жыццём.***

***Усё — гісторыі жывых людзей.***

***Тут ёсць і аповесці-фэнтэзі, заснаваныя на беларускай міфалогіі, наператрактоўцы народных казак. Кожны з гэтых, падавалася б, такіх адрозных твораў расказвае гісторыю, смешную ці сумную. Гісторыю пра нас. Пра наша жыццё, пра нашы карані і — пра наш агульны дом.***




Кудласевіч, А. А. Пераход : аповесць, апавяданні / А. А. Кудласевіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2013. — 191 с.

*Проза Анатоля Кудласевіча — гэта цікавае спалучэнне рэальнасці і фантастыкі, тонкага лірызму і глыбокага псіхалагічнага аналізу. Пісьменніка турбуюць вечныя пытанні быцця, праблема выбару і наканавання. Апавяданні Анатоля Кудласевіча заінтрыгуюць чытача дынамічным развіццём сюжэта, супярэчлівымі характарамі і нечаканымі развязкамі.*




**Ждан, А. Трэба цярпець : апавяданні, гумарэскі, пацешкі / Алег Ждан. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2014. — 302 с.**

***Жыццё чалавека пасля, так званай, перабудовы — вось агульны змест апавяданняў Алега Ждана. Людзі маладыя і сталыя, насельнікі сталіцы і малых беларускіх гарадоў — усе яны так ці інакш перажываюць і вечныя, і паўсядзённыя праблемы, выяўляюць характэрныя рысы народа. Піша Алег Ждан падчас з добрым гумарам, падчас з разуменнем драматычнасці жыцця, а часам — з горкай іроніяй.***




**Супрановіч, Т. І. Халодны дзень і цёплы вечар : аповесці, апавяданні / Таіса Супрановіч. — Мінск : Звязда, 2017. — 208 с.**

***У аповесцях і апавяданнях Таісы Супрановіч — гісторыі розных жаночых лёсаў, шчаслівых і нешчаслівых шлюбаў, неспакойнага і ціхага кахання, балючых і гаючых адносін. Жыццёвы шлях яе гераінь — гэта шлях няпростых, часам вымотваючых выпрабаванняў, якія могуць зламаць любога, але толькі не сапраўды моцных духам жанчын з ярка выражанай індывідуальнасцю.***




Дзятлаў, А. М. Памылка старага глушца : апавяданні, навелы, эцюды / Алесь Дзятлаў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2014. — 302 с.

***Аўтар больш за дваццаць гадоў працаваў у часопісе «Родная прырода». Шматлікія вандроўкі па запаведных мясцінах, вывучэнне жыцця лёсу і яго насельнікаў далі багаты матэрыял для напісання твораў. Чытач пазнаёміцца з дзікімі звярамі і птушкамі, спазнае іх поўнае небяспекі жыццё, даведаецца пра сапраўдныя трагедыі, што адбываюцца ў лясных нетрах. У некаторых апавяданнях уздымаюцца пытанні ўзаемадачыненняў чалавека з прыродай, яго часам жорсткае стаўленне да «братоў нашых меншых». Аўтар вядзе шчырую размову з сучаснікамі пра любоў і спагаду да ўсяго жывога на Зямлі.***




**Беланожка, А. М. Чамадан з кракадзілавай скуры : аповесць / Алёна Беланожка. — Мінск : выдавецкі дом «Звязда», 2014. — 176 с. — (Бібліятэка часопіса «Маладосць»).**

***Захапляльная аповесць з сучасным і сапраўды галівудскім сюжэтам. Перад галоўнай гераіняй, маладой жанчынай з дзёрзкім характарам, стаіць амаль што недасягальная мэта даведацца, каму спатрэбілася выкрасці яе, а пасля, нечакана для самой сябе, выратаваць свет. Усё гэта не можа адбыцца без дапамогі цэлай каманды хлопцаў і дзяўчат, якія, натхнёныя энергічнасцю сваёй сяброўкі, заўсёды гатовы пускацца ў самыя неверагодныя авантуры. Але ніякія прыгоды не адбыліся б, каб не дзіцячая мара галоўнай гераіні аб вялікім чамадане з кракадзілавай скуры... Аповесць адрасавана маладзёжнай аўдыторыі.***




**Гаўрыловіч, У. М. Палешукі : раманы і апавяданні / У. М. Гаўрыловіч. — Мінск : Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2018. — 312 с.**

***У кнігу беларускага пісьменніка Уладзіміра Гаўрыловіча ўвайшлі два раманы з трылогіі "Палешукі" і апавяданні. Творы ахопліваюць незабыўныя падзеі жыцця землякоў аўтара, пачынаючы з 1930-х гадоў, і закранаюць перыяд Вялікай Айчыннай Вайны. Праз непаўторныя, трагічныя лёсы палешукоў пісьменнік стварае шырокую панараму народнага жыцця.***




Прохар, М. Восень у Вільнюсе : аповесці і апавяданні / Маргарыта Прохар. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2014. — 319 с. : іл.

*Пад адной вокладкай пісьменніца сабрала шэраг рознапланавых твораў: гэта і філасофская аповесць, і жаночы дэтэктыў, і рамантычная гісторыя, і прыгоды.. Як гаворыць сама Маргарыта Пятроўна, гэта кніга падарожжаў не ў сезон у Вільнюс, Прагу, Санкт-Пецярбург, па Беларусі. Калі чалавек становіцца больш цярплівым да людзей, больш сталым, больш мудрым. Але б дзе чалавек не быў, ён вяртаецца заўсёды ў родную Беларусь. На сваю малую радзіму, дзе так вольна дыхаць, туды, куды імкнецца яго сэрца. Вось сапраўды, "Каб любіць Беларусь нашу родную, трэба ў розных краях пабываць..."*




Ткачоў, В. Характары : п'есы / Васіль Ткачоў. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2016. — 517 с.

*У кнігу ўвайшлі ў асноўным тыя творы, якія сёння запатрабаваны ў тэатрах: “Апошні” (“Белы ліст”), “Без Ягора будзе гора”, “Жаночы вулей”, “Марш Шульгіна”, “Стары і дарога”, “Flash”, “Веласіпед”, “Кветкі”, “Дошкі”, “Пераправа на Казанціп”, “Страказа і мурашык” і іншыя. Драматычныя творы лаўрэата прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі пісьменніка Васіля Ткачова шырока вядомы не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі. Творы напісаны жывой і вобразнай мовай, яны ўзнімаюць надзённыя пытанні нашага жыцця, вызначаюцца цікавымі сюжэтамі.*




**Палачанін, Ф. Ці так жывём : п’есы / Фёдар Палачанін. — Мінск : Народная асвета, 2017. — 388, [4] с. : іл.**

***У кнігу увайшлі драматычныя творы, якія вызначаюцца свежасцю і актуальнасцю праблем, жыццёвай праўдзівасцю, глыбокім псіхалагічным аналізам, неардынарным поглядам на жыццё. Тут асуджаюцца крывадушша і фальш, п’янства, здрада і маральная разбэшчанасць, паказаны складаныя адносіны паміж бацькамі і дзецьмі, пошукі шчасця, кахання. Творы карыстаюцца вялікім поспехам у чытачоў і гледачоў. І зусім невыпадкова, што яны трапляюць на сцэну раней, чым у друк.***




**Рублеўская, Л. І. Ночы на Плябанскіх млынах : раман, аповесць, апавяданні / Людміла Рублеўская. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2013. — 526 с.**

***У кнігу вядомай пісьменніцы Людмілы Рублеўскай увайшлі гатычны раман «Скокі смерці», у якім журналістка Ганна Барэцкая і рэстаўратар Юрась Дамагурскі разгадваюць таямніцу сярэднявечных гадзіннікаў, аповесць «Ночы на Плябанскіх млынах», дзе міфы і легенды Мінска пераплятаюцца ў запамінальную містычна-рамантычную карціну, цыкл «Старасвецкія міфы горада Б*», што спалучае антычныя міфы і рэаліі старасвецкага беларускага мястэчка, а таксама апавяданні, у якіх дзейнічаюць і паўстанцы Каліноўскага і Касцюшкі, і нашы сучаснікі. Героі Людмілы Рублеўскай вырашаюць адвечныя праблемы выбару паміж годнасцю і бяспекай, каханнем і здрадай, захаваннем гістарычнай памяці і абыякавасцю.***




**Рублеўская Л. Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча : раман прыгодніцкі і фантасмагарычны / Людміла Рублеўская. — Мінск : Звязда, 2014. — 320 с. — (Святло Мінуўшчыны).**

***У трэцяй кнізе цыкла Людмілы Рублеўскай, які распавядае пра прыгоды ў XVIII стагоддзі беднага шляхцюка Пранціша Вырвіча і полацкага доктара Баўтрамея Лёдніка, працягваюцца неверагодныя падзеі. Героям давядзецца шукаць езуіцкія скарбы ў сутарэннях пад Менскам, падарожнічаць у карэце з чорным магам і егіпецкай прынцэсай, прысутнічаць на балі ў палацы расійскай імператрыцы.***




Пісьмянкоў , А. У. Не знікаў : выбранае / Алесь Пісьмянкоў ; уклад. А. Пісьмянкова. — Мінск : Рэдакцыя газеты “Звязда”, 2012. – 296 с.

*"Не знікай" – так звычайна казаў на развітанне сваім сябрам Алесь Пісьмянкоў, і гэтыя словы гучалі як наказ, як спадзяванне на будучыя сустрэчы.*

*Укладальнік кнігі – жонка пісьменніка Алена Пісьмянкова сабрала пад адной вокладкай творы розных гадоў.*

*Пранікнёныя і светлыя радкі паэта і сёння знаходзяць водгук у сэрцах чытачоў, і жыццё А. Пісьмянкова, якое, на жаль, заўчасна абарвалася, працягваецца ў яго творах.*




**Бондар, Т. М. Спрадвечныя сцежкі : зборнік паэзіі / Таіса Бондар ; [укладальнік А. Толкач]. — Мінск : Звязда, 2015. — 302 с.**

***Кнігу склалі творы розных гадоў: вершы, кароткія паэмы-песні, у тым ліку паводле матываў народных легенд, паэма «Мы родам з вайны». Асэнсаванне гістарычнага шляху, які прайшоў беларускі народ, яго багатая песенная спадчына, памяць пра гады змагання і гераізму, імкненне да веры — асноўныя матывы творчасці Таісы Бондар.***




**Мятліцкі, М. Прысутнасць : вершы, паэма, вершаваная аповесць / Мікола Мятліцкі. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2017. — 495 с.**

***Новая кніга паэзіі “Прысутнасць” Міколы Мятліцкага — пра сутнасць самога чалавечага жыцця, поўнага і значных гістарычных падзей, і трывожных, ахвярных выпрабаванняў падчас прамінулых ліхалеццяў, і стваральнай радасці мірнага нашага зямнога бытавання, калі фізічнымі і духоўнымі намаганнямі, ўсяго народа будуецца маладая незалежная краіна ў цэнтры Еўропы. Яркімі паэтычнымі фарбамі аўтар стварае поўнамастацкі вобраз сучаснай Беларусі, гістарычнапомлівай і надзейнатрывалай сваёй чалавекалюбівай сутнасцю, не толькі прысутнай на геаграфічнай карце планеты, але і роўнай сярод роўных як сваёй гістарычнай веліччу, так і красой сённяшняй стваральнае моцы.***




**Кобец, М. У. У белым ветразі завей : вершы / М. У. Кобец. — Мінск: Народная асвета, 2018. — 174 с. : іл.**

***Аўтар кнігі, паэтка з брэсцкага Палесся, доўжыць традыцыі беларускіх паэтаў-класікаў, увабраўшы ў сваіх вершах і чысціню паэтычнай светлай лірыкі, і глыбіню філасофскай думкі. Яе творы — гэта багатая на мастацкія вобразы паэтычная вандроўка ў «буслiны край», а таксама спроба аўтара падштурхнуць чытача да развагаў аб сэнсе быцця, сэнсе існасці.***

***Разлічана на шырокае кола чытачоў.***




Башлакоў, М. З. Далеч вячэрняя : вершы, паэмы, араторыя / Міхась Башлакоў. — Мінск : Народная асвета, 2017. — 518 с. : іл.

*Паэзія лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Міхася Башлакова добра вядома чытачам. Ва ўсіх творах — ці гэта паэмы і араторыя, у якіх аўтар уздымае вострыя і балючыя праблемы нашай рэчаінасці: лёс Айчыны, народа, роднай мовы, горыч і боль чарнобыльскай трагедыі, пытанні маралі, духоўнасці, гістарычнай памяці, ці гэта проста лірычныя акварэльна-празрыстыя вершы, — у кожным ягоным паэтычным радку "жыве душа народа". Менавіта пранікнёным лірызмам, эмацыянальнасцю, шчырасцю, задушэўнасцю якраз і вылучаецца паэзія Міхася Башлакова. Новую кнігу вядомага паэта склалі лепшыя творы — вершы, паэмы, араторыя "Шлях".*

«Добрая кніга заўсёды з’яўляецца лепшым сябрам у жыцці»

Максім Тан



# *Чытайце па-беларуску!*

# *Няхай гучыць родная мов*

# *Чакаем вас у бібліятэцы.*

